Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.В. Сухога
Бібліятэка



# *Янка Купала*

## *(Іван Дамінікавіч Луцэвіч)*

## *1882-1942*

**Буклет прысвечаны**
**135-годдзю з дня нараджэння**

**Гомель 2017**

# Біяграфія

Янка Купала—беларускі паэт, драматург, публіцыст, перакладчык, класік беларускай літаратуры, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Народны паэт Беларусі (1925). Акадэмік АН БССР (1928), АН УССР (1929).

Нарадзіўся 25 чэрвеня 1882 года ў сям'і мяшчан.

Скончыў Бяларуцкае народнае вучылішча (1898). Пасля смерці бацькі (1902) працаваў на гаспадарцы, потым хатнім настаўнікам, пісарам у судовага следчага ў Радашковічах (1903), малодшым прыказчыкам у маёнтку Беліца памешчыка Караля Свяцкага ў Сенненскім павеце Магілеўскай губерні (1904), практыкантам і памочнікам вінакура ў маёнтку Сёмкава пад Мінскам, на бровары ў Яхімоўшчыне на Маладзечаншчыне, у маёнтку Дольны Сноў Наваградскага павета (1905—1908), супрацоўнікам «Нашай нівы» і адначасова бібліятэкарам бібліятэкі «Веды» Б. Даніловіча (Вільня, 1908—1909). У пачатку снежня 1909 з рэкамендацыйным лістом У. Самойлы да Б. Эпімах-Шыпілы пераехаў у Пецярбург, дзе вучыўся на агульнаадукацыйных курсах А. Чарняева (1909—1913), працаваў у Публічнай бібліятэцы, удзельнічаў у рабоце навукова-літаратурнага гуртка беларускіх студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта. З кастрычніка 1913 зноў у Вільні: сакратар «Беларускага выдавецкага таварыства», рэдактар «Нашай нівы» (1914—1915).

З набліжэннем фронту эвакуіраваўся з Вільні, жыў у Арле, у верасні 1915 выехаў у Маскву, дзе вучыўся ў Народным універсітэце. Са студзеня 1916 на вайсковай службе: некалькі месяцаў служыў у Мінску старшым рабочым у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін, потым у Полацку, Смаленску. З 1916 жанаты з Уладзіслалавай Луцэвіч. У ліпені 1918 атрымаў пасаду агента па забеспячэнні харчамі Заходняй вобласці. Быў слухачом факультэта гісторыі мастацтваў Смаленскага аддзялення Маскоўскага археалагічнага інстытута. У 1919, пасля абвяшчэння БССР, пераехаў на сталае жыхарства ў Мінск.

Неаднаразова падвяргаўся рэпрэсіям. Купала быў у гушчы літаратурнага і грамадскага жыцця. Пад час вайны пераехаў у пас. Пячышчы каля Казані.

18 чэрвеня 1942 Я. Купала прыехаў у Маскву і праз 10 дзён трагічна загінуў у гасцініцы «Масква» пры нявысветленых абставінах — упаў у лесвічны пралёт з 10 паверха. Існуе тры версіі — няшчасны выпадак, самагубства, забойства. Быў пахаваны на Ваганькаўскіх могілках у Маскве.

У ліпені 1962 урна з прахам Янкі Купалы перавезена ў Мінск і перапахавана на Вайсковых могілках.

# Творчасць

Пісаць пачаў на польскай мове. Першы вядомы беларускі верш «Мая доля» датаваны 1904 г. Першы надрукаваны верш на беларускай мове - «Мужык» (15 траўня 1905 г. у менскай газеце «Северо-Западный край»). У 1908 г. пецярбургскае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца» выпусціла першы зборнік паэта «Жалейка» (факсімільнае выданне ў 1982), у 1913 г. - зборнік «Шляхам жыцця». Зборнік вершаў «Гусляр» (1910) выдадзены ў Пецярбургу А.Грыневічам. У савецкі час выйшлі кнігі паэзіі «Спадчына» (1922), «Безназоўнае» (1925), «Апавяданні вершам» (у 2 кнігах, 1926), паэмы «Магіла льва» (1927), «Над ракою Арэсай» (1933), «Курган» (1987), зборнікі «Адцвітанне» (1930), «Песня будаўніцтву» (1936), «Беларусі ардэнаноснай» (1937), «Ад сэрца» (1940), «Беларускім партызанам» (вершы і артыкулы, Масква, 1942). Многія вершы пакладзены на музыку. Для дзяцей неаднаразова выдаваліся вершы «Хлопчык і лётчык», «Алеся» і інш.

Аўтар драматычных паэм «Адвечная песня» (Пецярбург, 1910, пастаўлена ў 1921) і «Сон на кургане» (Пецярбург, 1912), п'есы «Паўлінка» (Пецярбург, 1913), драматычнай паэмы «На папасе» (1913), драмы «Раскіданае гняздо» (Вільня, 1919), сцэнічнага жарту «Прымакі» (1920), п'есы «Тутэйшыя» (1924), драматычнага абразка «На Куццю» (Вільня, 1928). У 1989 г. выйшлі «Паэмы. Драматычныя творы» (уключаны трагікамедыя «Тутэйшыя», паэмы «Калека», «На Куццю» і іншыя творы, якія доўгі час былі забаронены).

Выступаў як публіцыст і літаратурны крытык. У 1972 г. выйшла кніга «Публіцыстыка».

Пераклаў на беларускую мову «Слова аб палку Ігаравым» (прозай і вершам), міжнародны пралетарскі гімн «Інтэрнацыянал», польскі тэкст у п'есах В.Дуніна-Марцінкевіча «Ідылія» і «Залёты», лібрэта оперы «Галька» С.Манюшкі, паэму А.Пушкіна «Медны коннік», шэраг вершаў і паэм Т.Шаўчэнкі, асобныя творы М.Някрасава, І.Крылова, А.Кальцова, А.Міцкевіча, У.Сыракомлі, М.Канапніцкай, Ю.Крашэўскага, У.Бранеўскага, Е.Жулаўскага, П.Панча і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1941) за зборнік «Ад сэрца».


ЯНКА КУПАЛА
СПАДЧЫНА


Янка Купала
Роднае слова


Янка Купала
ТУТЭЙШЫЯ


МАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІГА
ЯНКА КУПАЛА
МАЯ МАЛІТВА
ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ


Янка Купала
ПАЎЛІНКА


Янка Купала
З кутка жаданняў

# Інтэрнэт-рэсурсы

- **Беларуская палічка**

**http://knihi.com/Janka_Kupala/**

- **Сайт Янкі Купалы**

**http://www.yankakupala.ru/**

- **Архівы Беларусі**

**http://archives.gov.by/index.php?id=865692**

- **Дзяржаўны літаратурны Музей Янкі Купалы**

**http://kupala-museum.by/paet/biyagrafiya**

# Бібліяграфічны спіс

## Творы Янкі Купалы


1. Купала, Я. Вершы / Я. Купала. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1988. – 270 с.
2. Купала, Я. Вершы і паэмы / Я. Купала. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1982. – 431 с.
3. Купала, Я. Выбранае / Я. Купала. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – 224 с.
4. Купала, Я. Збор твораў : у 7-і т. / Рэд.калегія: В. В. Барысенка, П. У. Броўка, К. К. Крапіва і інш. – Мінск : Навука і тэхніка,1972 –1975. – 392 с.
5. Купала, Я. П'есы. Публіцыстыка. Янка Купала пра сябе / Я. Купала. – Мінск : Кніга, 2002. – 528 с.
6. Купала, Я. Тутэйшыя : Трагічна-смяшлівыя сцэны ў 4-х дзеях / Я. Купала. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. – 94 с.
7. Купала, Я. Курган : поэма / Янка Купала ; пер. с бел. Е. Полеес // Нёман. - 2016. — № 1. — С. 106—111.
8. Купала, Я. Орлятам : стихи: пер. с бел. / Я. Купала. – Москва : Дет. лит., 1962. – 110 с.


## Пра пісьменніка


1. Бярозкін, Р. С. Свет Купалы : думкі і назіранні / Р. С. Бярозкін. – Минск : Беларусь, 1965. – 304 с.
2. Купала і Колас, вы нас гадавалі : дакументы і матэрыялы / укладальнікі: В. Дз. Селяменеў, В. У. Скалабан. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2012. – 333, [2] с.
3. Літаратурны музей Янкі Купалы = Литературный музей Янки Купалы. – Минск : Беларусь, 1981. – 32 с.
4. Народныя песняры : да 90-годдзя з дня нараджэння Я.Купалы і Я.Коласа: зб.артыкулаў. – Минск : Выд.БДУ ім.У.І.Леніна, 1972. – 272 с.
5. Успаміны пра Янку Купалу. – Минск : Мастацкая літаратура, 1982. – 272с.
6. Юрэвіч, У. М. Янка Купала : нарыс жыцця і творчасці / У. М. Юрэвіч. – Мінск : Народная асвета, 1983. – 208 с. – (Народныя пісьменнікі БССР).
7. Янка Купала : жыцце і творчасць, 1882-1942 / склалі: І. К. Жыдовіч, Я. Ю. Раманоўская; [прадмова М. Лынькова]. – Мінск : Народная асвета, 1972. – 175 с.

8. Янка Купала : да 100-годдзя з дня нараджэння. : бібліяграфічны паказальнік / склад. Л. М. Бабкова [і інш.]. – Минск, 1984. – 410 с.
9. Ярош, М. Р. Янка Купала і Якуб Колас : параўн. аналіз творчасці / М. Р. Ярош. – Минск : Навука і техніка, 1988. – 192 с.
10. Лойко, О. А. Янка Купала / О. А. Лойка; авториз. пер. с белорус. – Москва : Молодая гвардия, 1982. – 349 с. – (Жизнь замечательных людей. Серия биогр. Вып.13 (630)).
11. Майхрович, А. С. Янка Купала и Якуб Колас : вопросы мировоззрения /А. С. Майхрович; Ред. В. М. Конон. – Минск : Наука и техника, 1982. – 248 с.
12. Мозольков, Е. С. Янка Купала : жизнь и творчество / Е. С. Мозольков. – Минск : Госиздат БССР, 1952. – 186 с.
13. Науменко, И. Я. Янка Купала. Якуб Колас : творческие портреты / И. Я. Науменко ; пер. с бел. В. Жиженко. – Москва : Советский писатель, 1982. – 287 с.
14. Шотт, И. М. Фольклор в творчестве Янки Купалы : (дорев. период) / И. М. Шотт. – Москва : Наука, 1968. – 192 с.

## Артыкулы з кніг і часопісаў

1. Галоўка, С. А. Любімы горад песняра : Барысаўшчына ў жыцці і творчасці Янкі Купалы / Сяргей Галоўка // Беларуская думка. – 2017. – № 7. – С. 38–45.
2. Гніламедаў, У. В. Спадчына паэта : да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа і Я. Купалы / У. В. Гніламедаў // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2012. – № 1. – С. 4–16.
3. Да калыскі Купалы : "Круглы стол" часопіса "Полымя" ў Вязынцы : 125-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы // Полымя. – 2007. – № 7. – С. 92–108.
4. Занеўская, І. Там, дзе лунае дух Купалы / Ірына Занеўская // Маладосць. – 2007. – № 6. – С. 88–94.
5. Запартыка, Г. З гісторыі першых творчых юбілеяў Янкі Купалы : да 125-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы / Ганна Запартыка // Маладосць. – 2007. – № 6. – С. 64–69.
6. Зэкаў, А. Тут - дыханне Купалы : 125-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы / Анатоль Зэкаў // Полымя. – 2007. – № 7. – С. 109–113.
7. Каваленя, А. А. Засталася спадчына - людзьмі звацца / А. А. Каваленя // Беларуская думка. – 2012. – № 5. – С. 72–76.
8. Казлова, В. У агні Вялікай Айчыннай : 125-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы / Вольга Казлова // Полымя. – 2007. – № 7. – С. 119–122.

9. Касцюк, М. П. Янка Купала — наш гонар і боль / М. П. Касцюк // Беларуская думка. – 2012. – № 7. – С. 44–45.
10. Ляшковіч, А. Скарбніца Купалавай спадчыны / А. Ляшковіч ; [размаўляў Сяргей Галоўка] // Беларуская думка. – 2012. – № 6. – С. 50–56.
11. Мятліцкая, Г. Міф і гісторыя ў паэзіі Янкі Купалы / Ганна Мятліцкая // Полымя. – 2006. – № 7. – С. 139–154.
12. "На добрую памяць..." : Вобраз класіка беларускай літаратуры Я. Купалы ў фотаздымках // Беларуская думка. – 2017. – № 7. – С. 46–47.
13. "Ноч плыла агнямі і зорамі... Нарадзіўся Янка Купала" : вершы // Маладосць – 2007. – № 6. – С. 5–7.
14. Падабедава, С. В. Эквівалентнасць вобразна-выяўленчых сродкаў пры перакладзе балады А. Міцкевіча "Пані Твардоўская" / С. В. Падабедава // Беларусь в современном мире : материалы VIII Международной научной конференции студентов, магистрантов и аспирантов, г. Гомель, 5 мая 2015 г. – Гомель, 2015. – С. 223–224.
15. Трэнас, В. Янка Купала сёння : інтэрпрэтацыі, асацыяцыі, уяўленні / Віка Трэнас // Маладосць. – 2007. – № 6. – С. 79–83.
16. Чарота, І. Янка Купала і Югаславія : з невядомага і малавядомага / Іван Чарота // Маладосць. – 2007. – № 6. – С. 70–78.
17. Чарота, І. Янка Купала ў Славакіі : 125-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы / Іван Чарота // Полымя. – 2007. – № 7. – С. 114–118.
18. Янка Купала. Да 100-годдзя з дня нараджэння. : бібліяграфічны паказальнік / Дзяржаўная ордэна працоўнага чырвонага сцяга б-ка БССР ім. У. І. Леніна літаратурны музей Янкі Купалы; склад. Л. М. Бабкова [і інш.]. – Мінск, 1984. – 410 с.
19. Голуб, Т. Янка Купала и Якуб Колас : некоторые итоги текстологической работы / Тереза Голуб // Нёман. – 2007. – № 3. – С. 173–178.
20. Купала Янка = Kupala Yanka // Гордость земли белорусской. – Минск, 2015. – С. 40–41.
21. Максимович, В. Путь согласия, гармонии и правды / Валерий Максимович // Наш современник. – 2007. – № 12. – С. 261–266.
22. Максимович, В. Путь согласия, гармонии и правды. : к 125-летию со дня рождения Янки Купалы / Валерий Максимович // Нёман. – 2007. – № 7. – С. 135–141.
23. Станкевич, Р. "Мир неповторимый и волнующий" : поэзия Я.Купалы и Я.Коласа в переводах на болгарский язык : к 125-летию со дня рождения Я.Купалы и Я.Коласа / Роза Станкевич // Всемирная литература. – 2007. – № 5. – С. 143–178.

24. Шабельцев, С. В. Якуб Колас и Янка Купала — символы белорусов в Аргентине / Сергей Шабельцев // Беларуская думка. – 2017. – № 10. – С. 46–50.
25. Шаладонова, Ж. "Гусляр" и "Гайдамаки" - свет в конце тоннеля / Жанна Шаладонова // Нёман. – 2008. – № 1. – С. 132–138.

**З літаратурай, прадстаўленай у буклеце, можна азнаёміцца ў бібліятэцы ГДТУ ім. П.В. Сухога.**

Аддзел даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы бібліятэкі ГДТУ ім. П.В. Сухога

# Помнікі



г. Масква




в. Вязынка




г. Гродна



г. Мінск



# *Янка Купала*

***(Іван Дамінікавіч Луцэвіч)***

***1882-1942***